# СВЯТЫ СЕРАФІМ ЖЫРОВІЦКІ – АХОЎНІК І ЗАСТУПНІК БЕЛАЙ РУСІ

**Л. Г. Шасцярнёва**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*
*E-Mail: lilija-shesternjova@rambler.ru*

Ляхавіччына – гэта незвычайны край у Брэсцкай вобласці, цудоўны кавалачак нашай Айчыны. З Ляхавіччынай паяднаны лёсы знакамітага празаіка Уладзіміра Дамашэвіча, гісторыка Віталя Скалабана, этнографа і фалькларыста Яна Чачота. У 1909 годзе ў вёсцы Флер’янава (раней называлася Старыя Вошкаўцы) гасцявала польская пісьменніца Элаіза Ажэшка. Адзін з дубоў, пасаджаных ва ўсходняй часцы дома, зараз носіць яе імя. Ляхавіцкая зямля ўзгадавала такіх таленавітых людзей, як мастак Мікалай Таранда, прафесар, доктар медыцынскіх навук Віталій Ракуць, вучоны-фізік Міхаіл Петух. Менавіта тут больш за 75 гадоў назад славуты Генадзь Цітовіч арганізаваў легендарны мастацкі калектыў – Падлескі народны хор. Тысячагадовая гісторыя праваслаўя нарадзіла святых зямлі беларускай, сярод якіх і ўраджэнец вёскі Падлессе Серафім Жыровіцкі (у міру – Раман Шахмуць). 28 кастрычніка 1999 года Свяшчэнным Сінодам Беларускай Праваслаўнай Царквы па блаславенні Свяцейшага Патрыярха Маскоўскага і Усяе Русі Алексія II архімандрыт Серафім Шахмуць быў далучаны да ліку мясцовашанаваных святых навамучанікаў зямлі беларускай, а ў жніўні 2000 года Архіерэйскім Саборам рускай Праваслаўнай Царквы ўслаўлены ў Саборы Навамучанікаў і спаведнікаў расійскіх XX стагоддзя. Памяць святога Серафіма ўшаноўваецца 6 верасня – у дзень, калі ён быў арыштаваны, і які стаў пачаткам яго крыжовага шляху [2]. Жыхары раёна лічаць Серафіма Жыровіцкага сваім яго сваім заступнікам і абаронцам.

Вёска Падлессе вядомая з канца XV стагоддзя, там жа пазней і была пабудавана Падлеская царква, якая мае цудоўную гісторыю [1, с. 75; 4; 5]. Ва ўсякім разе, з пакалення ў пакаленне перадаецца сказ пра цудатворны камень, што дапамог сляпой дзяўчыне стаць відушчай, пра выяву следу Маці Божай на ім. У 2009 годзе ў жыцці падлескіх прыхажан адбылася важная падзея: быў знойдзены валун, які, па меркаваннях вяскоўцаў, з’яўляецца тым самым каменем, на якім з’явілася ікона Божай Маці.

Гісторыя праваслаўнай царквы суправаджаецца подзвігамі многіх мучанікаў, святароў, праведных угоднікаў Божых. Адным з такіх верных Хрыстовых сыноў быў прападобнамучанік Серафім, архімандрыт Жыровіцкі – адзін з 23 навамучанікаў Беларусі, зямны шлях якога пачаўся ў Падлессі ў 1901 годзе ў сялянскай сям’і. Акрамя яго ў сям’і былі яшчэ два сыны – Рыгор і Сяргей. Па ўспамінах Надзеі Рыгораўны Баўтрукевіч, пляменніцы айца Серафіма (ёй расказаў дзед Сцяпан, родны дзядзька прападобнамучаніка), хлопчык пазбягаў дзіцячых забаў. *Ён з дзяцінства ведаў, што яго жыццёвы шлях – вера і дапамога людзям.*

Маленькі Раман надзяваў мамін фартух замест рызы, рабіў крыжыкі з палачак і, наколькі дазваляла дзіцячае ўяўленне і памяць, «служыў», як гэта рабілі ў Падлескай царкве. Бывала, у час такіх гульняў да яго падыходзілі суседскія дзеці, абступалі і дапамагалі «правіць службу». Хлопчык скончыў Ляхавіцкае двухкласнае вучылішча, а 25 чэрвеня 1922 года, адчуваючы ў сабе манаскае прызванне, Раман адправіўся ў Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр, дзе настаяцельстваваў архімандрыт Ціхан. 1 красавіка 1923 года Раман Шахмуць быў пастрыжаны ў манаства з імем Серафім, што азначае «палымяны». У манастыры нёс кліраснае паслушанне. У яго былі дасканалыя музычныя здольнасці. Праз 5 гадоў яго рукапалажылі іерадыяканам. Серафім вельмі адказна выконваў манастырскія паслушанні, з глыбокай пашанай адносіўся да богаслужэнняў. Яго любілі і паважалі і манастырскае начальства, і манахі. Пропаведзі айца Серафіма ў манастыры

прыцягвалі многіх. У сувязі з гэтым, яго разам з айцом Рыгорам пачалі адпраўляць у паездкі па прыходах з цудатворнай іконай Божай Маці. Там яны праводзілі богаслужэнні, малебны, акдрывалі храмы. Пабывалі ў Брэсце, Гродна, Ваўкавыску, Яблочыне, Бельску, Пружанах і многіх іншых гарадах і вёсках. Заўсёды сустракалі іх урачыста і шматлюдна. У 1929 годзе Серафім быў узведзены ў сан ігумена [3, с. 27].У 1935 годзе быў накіраваны ў вёску Курашава, што каля Гайнаўкі (цяпер Польшча), дзе праваслаўны прыход апынуўся ў цяжкім становішчы ў сувязі з актывізацыяй уніятаў. За два гады малітоўнай і падзвіжніцкай працы айцец Серафім дамогся значнага паляпшэння стану храма і прыхода і ўмацаваў дух праваслаўных вернікаў. У 1930-я гады айцец Серафім пазнаёміўся з архіепіскапам Панцеляймонам (Ражноўскім), які ў той час пражываў у Жыровіцкім манастыры. Менавіта пад уплывам уладыкі айцец Серафім паступова сфарміраваўся як манах высокага духоўнага жыцця.

Айцец Серафім часта наведваў роднае Падлессе. Па ўспамінах яго пляменнікаў Мікалая Рыгоравіча і Надзеі Рыгораўны, прыезд дзядзькі быў для ўсіх на сяле святам. Звычайна ў Ляхавічах яго сустракаў брат, і далей на кані яны дабіраліся да месца. Прыязджалі ў царкву. Народу збіралася мноства, «як на Вялікдзень», па ўспамінах відавочцаў, доўгажыхароў вёскі. А потым ішлі да дому Шахмуцёў. У такія дні хата не магла ўмясціць ўсіх жадаючых. Айцец Серафім прапаведаваў і вучыў людзей, блаславўляў, праводзіў. Часта з ім прыязджаў і свяшчэннаслужыцель Рыгор Кударэнка, які пазней стаў вядомы як архімандрыт Ігнацій. Назаўсёды ў памяці падляшан, асабліва пляменнікаў айца Серафіма, засталіся дні, калі ён бываў у сябе на радзіме [2].

У 1941 годзе прапаведніку Серафіму Жыровіцкаму была даручана высокая місія: арганізаваць прыхадское жыццё на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Так, непадалёку ад Гомеля ім быў адкрыты жаночы манастыр, а пасля яшчэ 74 храмы. Місіянерскую дзейнасць архімандрыт Серафіма працягваў да самога арышту. Мінск, населеныя пункты Капыльскага, Слуцкага, Уздзенскага раёнаў, Віцебск, Орша, Быхаў, Жлобін, Магілёў, Гомель – маршруты пралягалі па ўсёй Беларусі. Па вяртанні ў Мінск місіянер айцец Серафім пачаў весці службу ў Святадухаўскай царкве (сёння гэта кафедральны сабор беларускага Экзархата), займаўся міласэрнасцю, дапамагаў абяздоленым і немачным.У 1944 годзе 6 верасня айцец Серафім і іерэй Рыгор Кударэнка былі арыштаваны. Пяць дзён працягваўся допыт на месцы (у Гродна, дзе яны былі затрыманы), а затым арыштаваных перавезлі ў турму ў Мінск. Родны брат айца Серафіма Рыгор Шахмуць, які даведаўся пра яго зняволенне, адправіўся ў Мінск. Паміж братамі вялася перапіска. Здароўе бацюшкі ў турме было моцна падарвана.На допытах арыштаваныя трымаліся мужна. Ім прад'яўлялі абвінавачванні ва ўчыненні злачынстваў, якіх на самой справе не было. Следства працягвалася 10 месяцаў. 7 ліпеня 1945 года абодвум свяшчэннаслужыцелям быў вынесены прыгавор: пазбаўленне волі тэрмінам на 5 гадоў: іх адправілі ў лагеры Горкаўскай вобласці. На Вялікдзень айцец Серафім віншаваў палонных словамі «Хрыстос Уваскрос», за што ад турэмнага начальства зведаў здзекі і ў рэшце рэшт пакутніцкую смерць: паводле сведчанняў быў разарваны двума машынамі (па іншай версіі гэта былі коні).

У цяжкім становішчы апынуліся і сваякі айца Серафіма. Яны сталі роднымі «ворага народа». Шмат пакут ім таксама давялося перажыць. Нягледзячы ні на што, Рыгор Шахмуць зноў накіраваўся да месца зняволення брата. Аднак вярнуўся ні з чым. Пісьма ад айца Серафіма родныя таксама не дачакаліся. Стала зразумела, што любімага імі чалавека больш ніхто не ўбачыць. Па афіцыйных звестках, архімандрыт Серафім скончаўся ад сардэчнай недастатковасці.

Памяць святога Серафіма ўшаноўваецца 6 верасня – у дзень, калі ён быў арыштаваны, і які стаў пачаткам яго крыжовага шляху. Жыхары Ляхавіччыны з вялікай любоўю ставяцца да святога Серафіма Жыровіцкага. Напрыклад, 2 верасня, 2004 года праз Ляхавіцкі раён прайшоў шлях XI Беларускай рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святынь», якая несла Жыватворны агонь ад Труны Гасподняй і скіроўвалася ў старажытны Тураў – тагачасную сталіцу Дня беларускага пісьменства.

Вось што пісала раённая газета “Ляхавіцкі веснік” з гэтай нагоды: «… Адчуць цяпло і подых свяшчэннага агню змаглі і праваслаўныя вернікі Падлесся. Праз усю вёску да мясцовай Святадухаўскай царквы прайшлі хрэсным ходам з харугвамі ўдзельнікі экспедыцыі на чале з галоўным захавальнікам Жыватворнага агню іерэем Аляксандрам Якуцікам, мясцовыя жыхары і вучні школ. Для рабят былі праведзены ўрокі пісьменства. Былі зроблены прыпынкі і прачытаны малітвы каля месца, дзе нарадзіўся Святы Серафім Жыровіцкі, а таксама насупраць капліцы Святога вялікамучаніка Георгія Перамоганосца» (Ляхавіцкі веснік. № 83–84. 4 верасня 2004 г.).

*У 2017 годзе на Ляхавіччыне адбыліся першыя краязнаўчыя чытанні «Я тут, пад гэтым небам, нарадзіўся», прысвечаныя таленавітым ураджэнцам вёскі Падлессе, сярод якіх пачэснае месца займае постаць Серафіма Жыровіцкага. Яны прайшлі ў Падлескім сельскім Доме культуры. На мерапрыемства запрасілі жыхароў вёскі, вучняў і настаўнікаў школы, работнікаў цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, удзельнікаў мастацкай самадзейнасці раёна, краязнаўцаў і навуковых супрацоўнікаў (Ляхавіцкі веснік. 10 лістапада 2017).*

У ліпені гэтага ж года вернікі ўшаноўвалі 116-годдзе з дня нараджэння святога. Усе жадаючыя прынялі ўдзел у духоўна-асветніцкім аўтамотапрабегу «Ад новапакутнікаў да вытокаў духоўнасці беларускага краю», арганізаваным праваслаўным ляхавіцкім брацтвам у гонар святога прападобнамучаніка Серафіма, архімандрыта Жыровіцкага і хрысціянскім адукацыйным цэнтрам імя святых Мяфодзія і Кірыла.

Хрэсны ход з іконай Божай Маці «Жыровіцкая» прайшоў з 14 па 16 ліпеня па мясцінах, звязаных з жыццём, духоўным станаўленнем і дзейнасцю святога Серафіма. Маршрут правёў удзельнікаў аўтапрабегу ад Успенскага Жыровіцкага манастыра да Ляхавіч. Благачынны цэркваў Ляхавіцкай акругі протаіерэй Георгій Жытко нагадаў пра жыццё і духоўны подзвіг прападобнамучаніка Серафіма. У дзень нараджэння святога Серафіма святочная літургія адбылася ў храме Узвіжання Крыжа Гасподня ў Ляхавічах, у гэты ж дзень цудатворная ікона пабывала ў храме Святога Духа ў аграгарадку Падлессе (Ляхавіцкі веснік. 18 ліпеня 2017 г.).

З нагоды ўшанавання памяці прападобнамучаніка Серафіма ў Мінску 6 верасня 2016 года адбыўся першы мінскі квэст. Заданні для пазнавальнай гульні былі распрацаваны супрацоўнікамі Свята-Елісавецінскага манастыра г. Мінска на базе аўтарскай экскурсіі арганізатара квэсту Таццяны Хамянковай-Некрашэвіч, прысвечанай памяці св. Серафіма. Плануецца, што квэст будзе праводзіцца рэгулярна. Удзельнікі гульні мелі на руках жыццеапісанне святога разам з апісаннем існуючых альбо ўжо зніклых з карты Мінска аб’ектаў, асвечаных некалі прысутнасцю там будучага святога. А праваслаўныя вернікі маглі прайсці сцяжынамі пакутніцкага шляху вялікага беларускага святога XX стагоддзя і ўшанаваць яго памяць малітвай (http://stvladimir.by).

Мы павінны быць удзячныя а. Серафіму Журовіцкаму і а. Рыгору Кудрэнку за адчыненыя імі ў гады Другой сусветнай вайны 74 (!) царквы, зачыненыя камуністамі на тэрыторыі Беларусі і такія неабходныя пропаведзі для простага чалавека ў той няпросты час; за магчымасць для нашых продкаў быць адпетымі паводле хрысціянскага абраду, за магчымасць спавядацца, вянчацца ў царкве, быць хрышчонымі, за ўслаўленне слова Божага на ўсёй Белай Русі.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. *Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ляхавіцкага раёна. – БелСЭ, 1989. – 439 с.*
2. *Ляхавіцкі веснік 03.09.2013 // Рэжым доступу: http://www.lves.by/?p=13500. – Дата доступу: 25.04.2018.*
3. *Ляховичский район. Путеводитель. – Мн.: Дивимакс, 2015. – 37 с.*
4. *Ляхавіцкі раён: сцежкамі роднага краю / [Ляхавіцкі раённы выканаўчы камітэт. – Мінск: Рыфтур, [2009?]. – 38 с., уключаючы вокладку. – (Турыстычны даведнік).*
5. *Ляхавічы і ваколіцы [Выяўленчы матэрыял]: [фотаальбом / аўтары тэксту: В. Барадзіна, Г. Канько, С. Стыкуць. – Брэст : Рэкламна-інфармацыйнае агенцтва "Вечерний Брест", друк 2011 (макет 2010). – 95 с.*